# ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ГРАМАДСТВА І ДОСТУП ДА КУЛЬТУРЫ: ЗАДАЧЫ І ЗДЗЯЙСНЕННЕ Ў БЕЛАРУСІ

***Дз. А. Крывашэй,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Дасягненні ў сферы інфармацыйных камп’ютарных тэхналогій змянілі практыку баўлення вольнага часу і працы, аказалі істотны ўплыў на доступ да інфармацыі, фарміраванне супольнасцяў, сацыяльнае ўздзеянне, формы арганізацыі і чаканні адносна паслуг. Новыя тэхналогіі істотна змянілі вытворчасць і распаўсюджанне культурных даброт, адкрылі новыя магчымасці для дзеячаў культуры і захавання гістарычнай памяці. З кожным годам усё большую частку культурных даброт і паслуг можна атрымаць праз інфармацыйныя сеткі. Па меры таго, як людзі прызвычайваюцца да электроннага культурнага зместу і паслуг, мяняецца структура культурнага попыту на традыцыйныя паслугі.

У апошнія дзесяцігоддзі назіраецца змена спектра аказваемых паслуг у бібліятэках, музеях, архівах пад уздзеяннем новых тэхналогій. Для дзеячаў мастацтва і работнікаў культуры, вытворцаў і распаўсюджвальнікаў прадуктаў культуры інфармацыйныя сеткі прапаноўваюць сродкі для больш маштабнага ахопу аўдыторыі, уключэння ў яе тых, хто раней не цікавіўся культурнымі падзеямі.

У Плане дзеянняў, прынятым Стакгольмскай канферэнцыяй ЮНЕСКА ў 1998 г., адзначалася, што ўступленне ў інфармацыйнае грамадства і авалоданне кожным інфармацыйнымі і камунікацыйнымі тэхналогіямі з’яўляецца важным аспектам любой палітыкі ў галіне культуры [12]. Ставілася задача распрацоўкі палітыкі ў галіне захавання і развіцця архіваў, музеяў, бібліятэк і іншай інфармацыі па магчымасці ў лічбавай форме; стварэння механізмаў для палягчэння доступу да матэрыялаў, якія яны ўтрымліваюць, уключаючы садзейнічанне развіццю гэтых устаноў ў якасці цэнтраў інфармацыі, навучання і адукацыі на працягу ўсяго жыцця.

Бачылася важным, каб палітыка ў галіне культуры надавала асаблівую ўвагу заахвочванню і ўмацаванню мер і сродкаў, накіраваных на пашырэнне доступу да культуры для ўсіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

слаёў насельніцтва, на барацьбу з адчужэннем і маргіналізацыяй, на развіццё ўсіх працэсаў, што садзейнічаюць культурнай дэмакратызацыі.

У кастрычніку 2003 г. на 32 сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА былі прынятыя два дакумента, у якіх асаблівая ўвага была нададзена патэнцыялу інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогій з пункту гледжання іх ролі ў забеспячэнні свабоды выказвання меркаванняў, моўнай і культурнай разнастайнасці, магчымасці атрымання адукацыі і доступу да інфармацыі, у прыватнасці да інфармацыі, якая з’яўляецца грамадскім здабыткам. Гэтымі дакументамі з’яўляюцца «Рэкамендацыі аб развіцці і выкарыстанні шматмоўя і ўсеагульным доступе да кіберпрасторы» [9] і «Хартыя аб захаванні лічбавай спадчыны» [10].

У 2003 г. у Жэневе пад эгідай ААН адбылася Сусветная сустрэча на вышэйшым узроўні па пытаннях развіцця інфармацыйнага грамадства. У прынятай на ёй дэкларацыі прынцыпаў «Пабудова інфармацыйнага грамадства – глабальная задача ў новым тысячагоддзі» адзначалася, што развіццё мясцовага кантэнту, які адпавядае нацыянальным або рэгіянальным патрэбам, будзе спрыяць сацыяльна-эканамічнаму развіццю і стымуляваць удзел усіх зацікаўленых бакоў, у тым ліку жыхароў сельскіх, аддаленых і маргінальных раёнаў. Інфармацыйнае грамадства павінна ўсімі адпаведнымі метадамі, уключаючы перавод у лічбавую форму, збіраць і захоўваць культурную спадчыну для будучых пакаленняў [3].

З мэтай рэалізацыі палажэнняў дэкларацыі быў распрацаваны План дзеянняў да 2015 г. Сярод кантрольных паказчыкаў было вызначана забеспячэнне падключэння на базе інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій публічных бібліятэк, культурных цэнтраў, музеяў і архіваў. Сярод іншага была адзначана неабходнасць распрацоўкі нацыянальнай палітыкі і заканадаўства, дзякуючы якім бібліятэкі, архівы, музеі і іншыя ўстановы культуры ў інфармацыйным грамадстве маглі б у поўнай меры выконваць сваю функцыю пастаўшчыкоў кантэнту, у тым ліку традыцыйных ведаў, у прыватнасці забяспечваючы пастаянны доступ да запісанай інфармацыі [7].

У 2014 г. на Сусветнай сустрэчы на вышэйшым узроўні па пытаннях развіцця інфармацыйнага грамадства было агучана



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальнае бачанне Беларусі далейшай эвалюцыі канцэпцыі на перыяд пасля 2015 г. Сярод прыярытэтаў было адзначана наданне асаблівай увагі захаванню нацыянальнай ідэнтычнасці, культурнай спадчыны, нацыянальных моваў і развіццю мясцовага кантэнту, уключаючы алічбоўку бібліятэчных і музейных фондаў, архіваў [8].

У 2011 г. Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь была зацверджана Нацыянальная праграма паскоранага развіцця паслуг ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій на 2011–2015 гг. Асобным яе напрамкам з’яўлялася стварэнне і развіццё публічнай бібліятэчнай і архіўнай лічбавай службы, адаптаванай да інфармацыйнага грамадства. Адпаведна Дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. да канца 2015 г. планавалася поўная камп’ютарызацыя бібліятэк з падключэннем да сеткі Інтэрнэт і арганізацыяй электроннай пошты з улікам абнаўлення камп’ютарнага парку (20 % у год). У планах было стварэнне Нацыянальнага інтэрнэт-партала «Музеі Беларусі» (2012 г.); стварэнне і забеспячэнне функцыянавання сістэмы сайтаў з інфармацыяй аб беларускай культуры (2012–2013 гг.) і вэб-партала для падтрымкі культурнай дзейнасці беларускай дыяспары за мяжой (2013–2014 гг.). На 2011–2015 гг. планавалася стварэнне зводнага электроннага інфармацыйнага рэсурсу нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі; зводнага электроннага каталога бібліятэк Беларусі, перыядычных выданняў, спецыяльных відаў дакументаў; распрацоўка праграмнага забеспячэння для стварэння інтэрнэт-сайтаў бібліятэк рэспублікі і інтэграцыя з інтэрнэт-парталам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі; стварэнне электронных бібліятэк «Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар» і «Radzivilliana»; арганізацыя карпаратыўнай службы электроннай дастаўкі дакументаў на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі [4].

Як паказаў час, з-за недастатковага фінансавання Дзяржаўнай праграмы большасць з пералічаных мерапрыемстваў так і не была рэалізавана. Зводны электронны каталог ахапіў толькі чатыры бібліятэкі замест усіх рэспубліканскіх і абласных. На пачатак 2017 г. ў Беларусі былі камп’ютарызаваныя 83,3 % агульнай колькасці публічных бібліятэк краіны, а да Інтэрнэта падключана ўсяго 71,8 % [11]. Амаль палова наяўнага камп’ютарнага парку бібліятэк мела патрэбу ў мадэрнізацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У той жа час толькі 67 % хатніх гаспадарак у 2016 г. мелі камп’ютар, што не адпавядала міжнародным стандартам у сферы інфарматызацыі (не менш чым адно аўтаматызаванае працоўнае месца на 1 тыс. жыхароў). Пры гэтым толькі 62,5 % хатніх гаспадарак ў тым жа годзе мелі доступ да Інтэрнэта (з хатняга камп’ютара ці мабільнай прылады) [5, с. 74].

Павольна ўкараняліся інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ў музеях. У 2011 г. на базе Кармянскага раённага мемарыяльнага музея імя П. М. Лепяшынскага (Гомельская вобл.) быў адкрыты першы ў краіне Цэнтр інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. На пачатак 2015 г. у электронныя базы музеяў былі ўнесены 1 861 390 адзінак асноўнага фонду краіны (59 %). За 2014 г. прырост склаў 32 %. У Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь пры гэтым былі ўнесены 148 215 адзінак захоўвання, што складала 4,7 % ад колькасці музейных прадметаў асноўнага фонду [1, с. 167]. На 19 жніўня 2017 г. у Дзяржаўным каталогу Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь знаходзілася 160 648 музейных прадметаў [6].

На пачатак 2014 г. з 206 музейных устаноў краіны электронную пошту мелі 89 (43,2 %), а інтэрнэт-сайты – 46 (22,3 %). У некаторых абласцях сайты былі створаны толькі для аднаго-двух музеяў [2, с. 29]. Па нашых падліках, сярод 19 музеяў Брэсцкай вобласці сістэмы Міністэрства культуры на верасень 2017 г. уласныя сайты мелі 10 музеяў.

У Дзяржаўнай праграме «Культура Беларусі» на 2016–2020 гг. звяртаецца ўвага на невысокі ўзровень інфарматызацыі бібліятэк, недастатковыя тэмпы інфарматызацыі сферы гісторыка-культурнай спадчыны і яе прысутнасць у сусветнай інфармацыйнай прасторы. Сярод перспектыўных доўгатэрміновых праектаў называецца стварэнне Нацыянальнай электроннай бібліятэкі Беларусі, карпаратыўнай службы дастаўкі дакументаў на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Такім чынам, у новых тэхналагічных умовах адной з задач культурнай палітыкі стала забеспячэнне аднолькавай даступнасці культурных паслуг ва ўсіх рэгіёнах і для ўсіх катэгорый грамадства. Рэалізоўваліся намаганні па больш шырокаму прадстаўленню ў інфармацыйных сетках культурнага зместу, развіццю паслуг у галіне культуры ў напрамку, больш арыентаваным на кліентаў. Мэты і задачы інфарматызацыі сферы культуры адпавядалі сусветным тэндэнцыям. Аднак іх практычная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалізацыя не дазваляла весці гаворку аб належным узроўні развіцця інфармацыйна-камунікацыйнай прасторы ў сферы культуры.

*1.* Беларуская культура – 2014: стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця. – Мінск : Інбелкульт, 2015. – 420 с.

*2.* Беларуская культура сёння: гадавы агляд, 2013. – Мінск : Інбелкульт, 2014. – 238 с.

*3.* Декларация принципов «Построение информационного общества – глобальная задача в новом тысячелетии» [Электронный ресурс] // Организация Объединенных Наций. – Режим доступа : http://www.un.org/ru/events/pastevents/pdf/dec_wsis.pdf. – Дата доступа : 04.09.2017.

*4.* Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. // Нац. реестр прав. актов Респ. Беларусь. – 2011. – № 11, 5/33091.

*5.* Информационное общество в Республике Беларусь : стат. сб. – Минск : Белстат, 2017. – 109 с.

*6.* Колькасць музейных прадметаў, зарэгістраваных у Дзяржаўным каталогу Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] // Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу : http://dkmf.by/. – Дата доступу : 19.08.2017.

*7.* План действий Всемирного саммита по информационному обществу от 12 декабря 2003 г. [Электронный ресурс] // Всемирный саммит по информационному обществу. – М. : МОО ВПП ЮНЕСКО «Информация для всех», 2007. – С. 27–28. – Режим доступа : http://www.ifap.ru/library/book193.pdf. – Дата доступа : 04.09.2017.

*8.* Полный текст выступления И. Концевой, заместителя Министра связи и информатизации, на Всемирной встрече на высшем уровне по вопросам развития информационного общества (2014 г., г. Женева). [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.lawtrend.org/wp-content/uploads/2014/07/Polnyj-tekst-vystupleniya-I.-Kontsevoj.pdf. – Дата доступа : 04.09.2017.

*9.* Рекомендации о развитии и использовании многоязычия и всеобщем доступе к киберпространству [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/multilingualism_recommendation.shtml. – Дата доступа : 04.09.2017.

*10.* Хартия о сохранении цифрового наследия [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/digital_heritage_charter.shtml. – Дата доступа : 04.09.2017.

*11. Чарнякевіч, Ю.* «Бібліятэка на колах» – не інтэрнэт-клуб / Ю. Чарнякевіч // Культура. – 2017. – 14–21 крас. – № 15. – С. 3.

*12.* ЮНЕСКО. Исполнительный совет. Сто пятьдесят пятая сессия. План действий по политике в области культуры в интересах развития [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://unesdoc.unesco.org/images /0011/001130/113036R.pdf. – Дата доступа : 04.09.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ